УДК 394(=411)»18»

# ЗНЕШНІЯ ЎПЛЫВЫ Ў ФАРМІРАВАННІ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ ПРЫВІЛЕЯВАНЫХ САСЛОЎЯЎ БЕЛАРУСІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТАГОДДЗЯ

*С.А. ШЫДЛОЎСКІ*
*(Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*Разглядаецца пытанне развіцця матэрыяльнай культуры прывілеяванага саслоўя Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. У прыватнасці, даследуюцца змены ў вопратцы, харчаванні, арганізацыі прадметна- побытавага асяроддзя. Дадзеныя тэндэнцыі падаюцца ў рэчышчы ўзаемадзеяння традыцыі і знешніх уплываў. Праводзіцца аналіз мемуарных крыніц, а таксама іканаграфічных матэрыялаў. Робяцца вы-сновы пра выспяванне уніфікацыйных тэндэнцый у абсягу матэрыяльнай культуры прывілеяванага гра-мадства Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, якія вынікалі з узмацнення ўплываў як заходнееўра-пейскай, так і расійскай культуры ў Беларусі. Найбольш інтэнсіўна гэты працэс закрануў асяроддзе арыстакратыі і заможнай шляхты. Як вынік развіцця грамадства ў першай палове XIX стагоддзя кан-статуецца паступовая страта шляхецкай культурай сваёй дамінуючай пазіцыі і замыканне яе ў межах радавых сядзіб.*

**Уводзіны.** Прадстаўнікі прывілеяванага грамадства Беларусі значную частку свайго часу бавілі традыцыйна па-за горадам. У планаванні сядзібы выяўлялася жыццёвая філасофія землеўладальнікаў, рэалізавалася іх уяўленне пра бяспеку і свабоду. «Радавое гняздо» было ўвасабленнем «малой радзімы». З'яўляючыся крыніцай сямейных традыцый і паданняў, сядзіба ўплывала на фармаванне саслоўна-родавай ідэнтычнасці прадстаўнікоў прывілеяванага грамадства. Маёнтак выконваў таксама рэпрэзентатыўныя функцыі: ён існаваў па законах гасціннасці і сведчыў аб грамадскім статусе і дабрабыце свайго гаспада-ра. Заданні глорызацыі роду, выхавання маладога пакалення вырашаліся ў межах сядзібы разнастайнымі сродкамі. Франтоны порцікаў і брам шляхецкіх сядзіб запаўняліся гербавымі картушамі ўладальнікаў маёнтка. Сцены аздабляліся мемарыяльнымі дошкамі з нагоды гістарычных падзей, якія звязваліся з да-дзенай сядзібай. Захоўваліся партрэтныя галерэі продкаў, мемарыялізаваліся месцы пахавання. Сямей-ным гонарам рабіліся фундаваныя родам бажніцы. Многія сем'і збіралі старадаўнія памяткі, кнігі, прад-меты мастацтва. Падобныя маёнткі рабіліся асяродкамі культуры, той першай школай, дзе маладое пака-ленне набывала веды пра край і род.

З уваходам Беларусі ў склад Расійскай імперыі ў прывілеяваных станах беларускага грамадства ўзмацніліся вестэрнізацыйныя працэсы. Арыентацыя на агульнаеўрапейскую моду ўспрымалася як перадумова захавання традыцыйнага шляхецкага ладу жыцця. Патрыёты колішняй Рэчы Паспалітай пачувалі сябе ўжо не «сарматамі», а еўрапейцамі – прадстаўнікамі заходняй цывілізацыі. Разам з ідэямі французскага класіцызму і асветніцтва, а пазней – рамантызму ў прывілеяваным грамадстве Беларусі распаўсюджваюцца новыя ўяўленні пра прыгажосць прыроды, гігіену і камфорт. Апошняе паўплывала на спосаб арганізацыі побытавага асяроддзя, культурнага ландшафту маёнткаў.

**Асноўная частка.** У стварэнні ансамбляў беларускіх маёнткаў прымалі ўдзел як мясцовыя архітэктары А. Бусырскі, А. Градзецкі, К. Падчашынскі, Б. Тычэцкі, так і іншаземцы: расійскія дойліды М. Львоў, І. Староў; заходнееўрапейцы Дж. Кварэнгі, Дж. Сака, К. Спампані, Я. Габрыэль, Я. Бекер, М. Шульц, А. Ідзкоўскі, Д. Кларк, Ф. Яшчалд ды інш. Будынкі ў стыле класіцызму ўтрымлівалі формы антычных ордэраў, якія сумяшчаліся з мясцовымі прыёмамі бутавага і драўлянага будаўніцтва. У рамантычнай архі-тэктуры выкарыстоўваліся элементы рэтраспектыўнай готыкі: вокны стральчатага малюнка, зубчастыя парапеты па перыметры збудавання, востраканечныя вежы, стральчатыя ўваходы-аркі. Часта ў сядзібных і сядзібна-паркавых ансамблях Беларусі дадзенага перыяду спалучаліся архітэктурныя формы розных стыляў [1, с. 176].

Для панскага жытла абіраліся ўзвышаныя мясцовасці сярод прыгожых краявідаў, адасобленыя ад вёсак [2, с. 57]. Пейзажныя – «англійскія» – паркі падкрэслівалі асаблівасці наваколля, вадаёмы мелі натуральныя абрысы. Часам на іх фармавалі выспы з альтанкамі і арачнымі масткамі. Існавалі паркі, у якіх змешваліся элементы рэгулярнага і пейзажнага стыляў. Паркі ў рамантычным гусце падаваліся як месца для медытацыі, паэтычнага кантакту з прыродай. Гэтай мэце служылі гроты, плакучыя формы дрэў і хмызоў, «зялёныя» альтанкі, разнастайныя помнікі, абеліскі, камяні з эпітафіямі, мемарыяльныя дрэвы. У парках месціліся і гаспадарчыя пабудовы – вяндлярні, вінакурні, кузні, лядоўні, млыны. У зоне рэкрэацыі можна было сустрэць звярынец. У мемарыяльнай – капліцу-пахавальню.

Дамы будаваліся ў глыбіні сядзібы. Да маёнтка вялі прысады. Тутэйшае панства нярэдка фундавала і размяшчала ў сваіх уладаннях бажніцы, якія ўтваралі агульны архітэктурны ансамбль з сядзібным домам. Перад жытлом звычайна знаходзіўся парадны двор з адным ці двума флігелямі, далей – гаспадарчы (з лямусам, свірнам ці клецццю, стайняй, вазоўняй, лазняй і гэтак далей). На парадным двары традыцыйна разбіваўся газон з клумбай, здаралася, з сонечным гадзіннікам, калодзежам, з самотнай ліпай ці дубам. Двор меў агароджу і браму, зазвычай гасцінна адчыненую [3, с. 75 – 105].

Эканамічная неаднастайнасць прывілеяваных саслоўяў абумовіла варыятыўнасць экстэр'ера і інтэр'ера сядзіб. Тыповымі паселішчамі дробнай шляхты ў Беларусі з'яўляліся аколіцы, фальваркі і засценкі. Апошнія налічвалі дзве-чатыры сядзібы. Жытло дробнай шляхты захоўвала традыцыйны завядзёнак забудовы (замкнуты ці П-падобны) і планіроўкі жытла (хата + сенцы + хата) і складалася з чатырохпяці пакояў. Дом падзяляўся на гаспадарчую (кухня, камора) і прыватную паловы (спальня, сталовая), рэпрэзентатыўная – адсутнічала. Сядзібы «шарачкоў» набліжаліся да мясцовых ўзораў жытла заможнага сялянства [4, s. 149]. Распаўсюджаным тыпам небагатай сядзібы былі драўляныя збудаванні пад саламянай ці дранкавай страхой з ганкам і сенцамі ў цэнтры [5, с. 170]. Такім быў, напрыклад, дом у фальварку Завоссе (цяпер Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці), дзе нарадзіўся польска-моўны паэт А. Міцкевіч. Яго бацькоўскі дом уяўляў сабой працяглы па франтону нешаляваны зруб на дзве паловы з сенцамі пасярэдзіне, накрыты саламяным дахам, з вылучаным па цэнтры двухслуповым ганкам [6, с. 201]. На малюнках Н. Орды найбольш распаўсюджаным тыпам дробнапамесных сядзібаў з'яўляўся аднапавярховы прамавугольны ў плане дом на дзве паловы, з чатырохкалонным порцікам-ганкам па цэнтры франтальнага фасада і невялікай мансардай над ім [7, с. 7]. Але і бедныя шляхецкія сем'і арыентаваліся на панскія стандарты і па магчымасці капіравалі іх. На фарміраванне густаў уплываў як прыклад больш заможных суседзяў, так і розныя трактаты і календары.

Сядзібы сярэдняй заможнасці налічвалі ад сямі да дзесяці пакояў (напрыклад, сталовая, гасцёўня, салон, пакой пана, пакой пані, пакоі дзяцей), гаспадарчая частка звычайна выносілася вонкі, дом меў падзел на парадную і прыватную часткі. Заможная сядзіба ўтрымлівала больш за дзесяць пакояў. Калі яна мела два паверхі, парадная і прыватная паловы маглі месціцца кожная на сваім узроўні. Аб парадным прызначэнні паверху маглі сведчыць высокія прамавугольныя вокны і наяўнасць круглых люкарнаў «другога святла» [6, с. 221]. Сядзібы мелі пераважна анфіладную планіроўку (двухрадную або аднарадную), зрэдку – калідорную. Выкарыстоўваўся і змешаны тып унутранай арганізацыі пакояў.

У першай чвэрці XIX стагоддзя адсутнічала выразная размежаванасць фукнкцый пакояў, якія часта адрозніваліся толькі па колеру сцен і адпаведнай абіўцы мэблі («блакітны», «ружовы» і гэтак далей).

У доме існаваў падзел на мужчынскую і жаночую паловы. У кабінеце, ці канцылярыі, гаспадара захоўваўся хатні архіў, тут прымалі афіцыйных гасцей. Да мужчынскай паловы дому адносілася таксама бібліятэка. Сенцы падзялялі дом на рэпрэзентатыўную і гаспадарчую часткі. Выразную функцыянальную пры-належнасць мела сталоўка. Са сталовай межавалі адзін ці два крэдэнсы, невялікія пакоі ці шафы для захоўвання посуду. Абавязкова меліся адна-дзве спальні з асобнымі гардэробнымі, алькоў.

У другой чвэрці XIX стагоддзя падзел дому на жаночую і мужчынскую паловы нівелюецца. За пакоямі замацоўваецца больш пэўная функцыянальная прыналежнасць. Прыжываюцца новыя адмены пакояў – будуары, салоны, якія адпавядалі змяніўшымся ў грамадстве ўяўленням пра камфорт і свецкае баўленне часу. У панскіх рэзідэнцыях сенцы саступілі сваю функцыю холам і вестыбюлям зараднымі лесвіцамі. У салоне праходзілі ўрачыстасці, прымаліся госці, ставілася на Каляды елка. Існавалі дзіцячыя пакоі, часам, некалькі – спальны і для навучання. Дзеці розных узростаў ды полу размяшчаліся асобна. Бальная, ці цэнтральная зала, більярдны пакой, будуары, хатнія капліčкі, зашклёныя зімовыя сады і аранжарэі, дзе вырошчваліся экзатычныя расліны (магноліі, кіпарысы, міртры, пальмы, цытрусавыя), сустракаліся звычайна ў заможных сем'ях.

Жытло ацяплялася шведскімі ці галандскімі кафлянымі печкамі (або традыцыйнымі грубкамі) і камінамі. Іх дэкаратыўнае афармленне адпавядала пануючым мастацкім стылям. Даволі часта яны мелі прастакутныя формы, але сустракаліся і акруглыя, калонападобныя, на ножках у ампірным стыле, у выглядзе піраміды. Ужывалася пераважна кафля мясцовай вытворчасці, на якую паўплывалі саксонскія, французскія і галандскія ўзоры [5, с. 188]. Пад уплывам класіцызму выкарыстоўвалася аднатонная (найчасцей белая ці зялёная) кафля з ураўнаважаным і спакойным рэльефным дэкорам [8, с. 67]. У аздабленні камінаў выкарыстоўваўся мармур, граніт, барэльефы, каваныя рашоткі [6, с. 171].

Асвятляліся сядзібы алейнымі лямпамі і самаробнымі свечкамі з жывёльнага тлушчу ды воску. Стэарынавыя свечкі, вынайдзеныя ў Францыі ў першай палове XIX стагоддзя, мелі невялікую распаўсюджанасць з-за схільнасці мясцовай шляхты захоўваць традыцыйны парадак самазабеспячэння прадуктамі ўласнай гаспадаркі. У заможных дамах шырока выкарыстоўваліся бронзавыя, латунныя, срэбныя ці

драў-ляныя з пазалотай люстры, насценныя хрустальныя бра, бронзавыя шматражковыя кандэлябры, фарфо-равыя лямпы. Агонь распальвалі з дапамогаю крэсіва.

Падлога звычайна была драўляная. У рэпрэзентатыўных пакоях выкарыстоўваўся ўзорысты паркет і дываны турэцкай, персідскай або хатняй работы. Паркет выраблялі з ясеню, дуба, грушы ды іншых гатункаў. У гаспадарчых пакоях падлога магла быць цаглянаю.

Сцены абіваліся шпалерамі (штофам, атласам), дубовымі панелямі або ўпрыгожваліся мастацкімі роспісамі, ляпнінай, габеленамі. Над тэхналогіяй і арнаментам тканін для шпалер на мясцовых мануфактурах працавалі майстры з Францыі, Нямеччыны, Галандыі, Бельгіі, Швейцарыі. У сюжэтах габеленаў выкарыстоўвалі палотны славутых заходнееўрапейскіх майстроў, геральдычныя матывы.

У першай палове XIX стагоддзя ў інтэр'еры жытла прывілеяванага саслоўя Беларусі выкарыстоўвалася звычайна match разнастылёвая мэбля. Побач суседнічалі ўзоры ў стылі Людовіка XV, Людовіка XVI, ампір, бедэрмеер. Карысталася попытам імпартная мэбля, напрыклад, Крулявецкая [9, с. 179]. Мясцовыя ўзоры капіравалі заходнія. Напрыклад, у Мінску выраблялася мэбля ў стылі Людовіка Філіпа. Мэбля размяшчалася каля сцен сіметрычна. Яе часта абівалі ў тон шпалер. Тэндэнцыяй эпохі было імкненне да большага камфорту. Моднымі зрабіліся інтэр'еры з гісторыка-этнічным акцэнтам – антычным, турэцкім, маўрытанскім, індыйскім і гэтак далей. Неад'емнай часткай інтэр'ера з'яўляліся музычныя інструменты: раяль, піяніна, клавесін. Салоны, гасцёўні ахвотна аздабляліся вялікімі люстэркамі ў багата дэкарыра-ваных асадах.

Інтэр'ер многіх сядзіб упрыгожвалі каштоўныя калекцыі. Гэта маглі быць зборы жывапісу, перадусім пейзажы ў італьянскім і галандскім стылях, айчынныя карціны на рэлігійныя і гістарычныя сюжэты, сямейныя партрэты, французскія гравюры. Падобныя галерэі складаліся як з копій, так і сапраўдных твораў замежных (Рэмбрант, Рубенс, Лампі, Вато ды іншыя) і айчынных (В. Ваньковіч, Я. Дамель, Я. Сухадольскі ды інш.) аўтараў. Каштоўным было начынне сталовых, што складалася ў багатых сем'ях з калекцый саксонскага, мейсенскага, французскага, італьянскага фарфору, сталовага срэбра. Упрыгожвалі панскія сядзібы Беларусі скульптуры, гадзіннікі, габелены, зброя і гэтак далей.

Посуд, іншыя шкляныя мастацка-дэкаратыўныя вырабы, габелены, шпалеры часта былі мясцовага паходжання, але тэхналогія іх вырабу паходзіла з Францыі, Германіі, Галандыі ды іншых заходнееўрапейскіх краін [5, с. 186]. Тым не менш за колькі дзесяцігоддзяў дадзеныя тэхналогіі былі дастасаваны да мясцовых мастацкіх традыцый [8, с. 208].

Да элементаў традыцыйнага інтэр'ера можна аднесці калекцыі зброі, радавыя галерэі, вянкі з жыта і палявых кветак, хлеб с соллю на стале. Гэтыя складнікі інтэр'ера мелі не толькі дэкаратыўныя, але і сімвалічныя функцыі. Вестыбюлі афармляліся часта ў «паляўнічым» стыле з выкарыстаннем мядзведжых і воўчых скураў, мэблі, аздобленай рагамі жывёлін ды іншых трафеяў.

Пасля паразы паўстання 1830 году шляхецтва засяродзілася на прыватным жыцці. Са зменамі грамадскіх прыярытэтаў адбывалася трансфармацыя побытавага асяроддзя. Панскія двары перарабляліся суладна заходнееўрапейскім крытэрам камфорту, чысціні, эстэтычнасці. За ўзоры браліся англійскія катэджы і італьянскія вілы. Інтэр'ер мусіў быць не проста функцыянальным, але і густоўным, стварацъ адпаведныя псіхалагічныя варункі, адпавядаць сучасным правілам свецкіх паводзінаў, якія дыктавала Францыя. Бацькоўскія сядзібы, што мелі пэўную гістарычную каштоўнасць, часцяком руйнаваліся маладымі гаспадарамі – жанчыны ды моладзь заўжды выступалі заўзятарамі мадэрнізацыі сядзіб і намагаліся датрымлівацца модных павеваў. Вялікую страту традыцыйнаму выгляду сядзібаў наносілі пажары, – шмат шляхецкіх дамоў заставаліся драўлянымі – «пекна складзеныя стосы паліва», як жартавалі сучаснікі. Многія маёнткі ў выніку канфіскацый пераходзілі да новых уладальнікаў, што таксама не спрыяла захаванню ранейшага культурнага ландшафту.

Такім чынам, рэчыва-побытавае асяроддзе сядзібаў прадстаўнікоў прывілеяванага грамадства Беларусі першай паловы XIX стагоддзя фармаваліся адпаведна эстэтычна-мастацкім патрабаванням касмапалі-тычнай у сваім грунце моды з улікам гістарычных, эканамічных і прыродных варункаў.

Дынаміка міжкультурных сувязяў у першай палове XIX стагоддзя прасочваецца і ў эвалюцыі адзення (больш шырока – строю [10, с. 7]) прывілеяванага грамадства Беларусі [11, с. 22].

Напачатку XIX стагоддзя ў грамадстве назіралася тэндэнцыя змешваць розныя манеры апранацца. Людзі сталага ўзросту надавалі перавагу або традыцыйнаму шляхецкаму строю, або заходнееўрапейскай модзе другой паловы XVIII стагоддзя, а моладзь датрымлівалася найноўшых зменаў крою. Строй падкрэсліваў палітычныя погляды, – «сармацкую» вопратку насілі кансерватары, а «нямецкую» – рэфарматары- «касмапаліты» [12, с. 320]. Кунтуш і жупан, якія ўжо паспелі выйсці з моды, апраналіся прадстаўнікамі сярэдняй шляхты і арыстакратыі пераважна з гледзішчаў патрыятызму. Масавае вяртанне да традыцый-най вопратцы адбывалася падчас паўстанняў. Сярод паўстанцаў 1830 – 1831 гадоў былі папулярнымі чамара, кунтуш і жупан. Інсургенцкі строй дапаўнялі шабля-карабела і ядвабны пас [13, s. 129]. Жанчыны выяўлялі свае грамадзянскія пачуцці, апранаючыся ў цёмнае на знак жалобы пасля

паразы шляхецкіх выступаў. Дэмакратычна настроеныя студэнты Горы-Горацкага земляробчага інстытута выкарыстоўвалі ў сваёй штодзённай вопратцы элементы беларускага сялянскага адзення [14, с. 397].

Па вопратцы можна было вызначыць і занятак – адмысловыя мундзіры насілі не толькі вайскоўцы, але і работнікі канцылярый, студэнты. Важнай аздобай строю чыноўніка з’яўляліся ўзнагароды, па якіх, «як па паслужным фармуляры», можна было прачытаць біяграфію чалавека [15, с. 10].

Праваднікамі новых тэндэнцый былі часопісы мод, якія пачалі друкавацца ў Еўропе з XVII стагоддзя [16, с. 59]. Яшчэ адной крыніцай модных уплываў з’яўлялася літаратура. Тэксты Ё. Гётэ, В. Скота, Дж. Байрана падказвалі моднікам новыя дэталі строю, кшталту блакітных фракаў, жоўтых камізэлек ці шатландскай матэрыі «ў краткі» [13, s. 125]. У прывілеяваным грамадстве Беларусі з’явіўся рамантыза-ваны тыпаж, аналаг англійскага дэндзі, увасабленнем якога сучаснікі лічылі князя Ф. Сапегу [17, с. 108]. Свецкае захапленне аматарскім тэатрам садзейнічала пранікненню ў штодзённую вопратку арыстакратыі гульнявога элементу: тагачаснае прыватнае жыццё падабала драпіравацца ў шаты гістарычнай ды ўсход-няй экзотыкі.

У беларускага шляхецтва ўзорам для пераймання з’яўляліся арыстакратычныя колы Варшавы, якія ў сваю чаргу арыентаваліся на густы заходнееўрапейскай моды – Парыжу, Дрэздэну, Лондану. Змены ў строі варшаўскай арыстакратыі падхопліваліся сярэдняй беларускай шляхтай. Нават у невялікіх правін-цыйных гарадах Беларусі шляхцянкі знаходзілі магчымасць замаўляць бальныя сукні, каптуркі, пальчаткі, абутак у Варшаве [2, с. 47]. Прадстаўнікі арыстакратычных радоў Беларусі значную частку свайго часу бавілі ў сталіцах і курортах Заходняй Еўропы. Сярод гэтай часткі беларускага прывілеяванага грамадства засваенне новых павеваў еўрапейскай моды адбывалася аператыўна і з «першых рук».

XIX стагоддзе азначаецца касмапалітызацыяй моды. Падставамі імклівага развіцця моды былі сацыяльныя і эканамічныя рэвалюцыі. Хуткае развіццё прамысловасці, дынамічныя змены мастацкіх сты-ляў спрыялі з’яўленню новых тканінаў, аксесуараў, што абвастрала канкурэнцыю і стымулявала змену моды. Айчынныя вытворцы таксама ўлучыліся ў канкурэнтнае змаганне. На беларускіх кірмашах і кан-трактах вылучалася сукно фабрык графа Патоцкага, Камінскага і Скірмунта, мультан лагойскай фабрыкі графа Тышкевіча. Мужчынскі і жаночы абутак мінскіх шаўцоў меў добры попыт як у Беларусі, так і за яе межамі [2, с. 150]. Яшчэ адной падставай дынамізацыі моды з’явілася падвышэнне жаночай канкурэнцыі на шлюбным рынку. Адбылася змена матрыманіяльных стратэгій. Новаўвядзенні кшталту рэдутовых вечарын – камерцыйных маскарадаў – адкрывалі патэнцыйную магчымасць жанчынам, што паходзілі з небагатых радоў, звярнуць на сябе ўвагу прадстаўнікоў арыстакратыі. Падвышэнне сацыяльнай мабіль-насці рабіла моду інструментам дасягнення поспеху.

Такая з’ява канца XVIII – пачатку XIX стагоддзя, як фаварытызм, суладна якой для прадстаўнікоў уладнай эліты зрабілася прэстыжным дэманстраваць свае пазашлюбныя сувязі – «мужы з’яўляліся фірмаю, жонкі – таварам» [17, с. 228], улучала жанчын у дзяржаўныя сферы. Павялічвалася роля салонаў у механізме прыняцця палітычных выракаў. Салоны сумяшчалі гульнявыя формы баўлення часу з грамадска-палітычнымі абмеркаваннямі, і рабілі моду чыннікам палітычнага жыцця.

Сацыяльныя рэвалюцыйныя зрухі ў грамадствах Заходняй Еўропы, што знаходзілі пакрысе свой водгук і ў Расійскай імперыі, рабілі непажаданым залішнюю дэманстрацыю багацця ў вопратцы. Як вынік, строй пачынаў дэмакратызавацца. Адрозненні ў знешнім выглядзе арыстакратыі і сярэдняй шляхты паступова зводзіцца да якасці матэрыялу, з якога зроблена вопратка, ступені майстэрства краўца, шыкоўнасці аддзелкі і майстэрства насіць строй. У Расійскай імперыі ад часоў Пятра I знешні выгляд падданых лічыўся «государевым делом» і рэгламентаваўся заканадаўчымі актамі. Лічылася, што уніфікацыя адзення мусіць спрыяць нівеліроўцы нацыянальных асаблівасцей насельнікаў імперыі і іх хутчэйшай асіміляцыі. Знешні выгляд, строй, нават, форма вусоў і барады служылі візітнай карткай добранадзейнасці [18, с. 50] і сацыяльнага статусу, што вымагала да мімікрыі ў вопратцы. Агульным вынікам касмапалітызацыі еўрапейскай моды [19, с. 192] і намаганняў расійскай дзяржаўнай адміністрацыі па культурнай нівеліроўцы насельніцтва імперыі з’явілася спрашчэнне і уніфікацыя, якія найбольш прыкметнымі былі ў дачыненні мужчынскай вопраткі.

Развіццё строю прывілеяванага саслоўя Беларусі першай паловы XIX стагоддзя часткова супадае з тэндэнцыямі агульнаеўрапейскай моды. На строй прывілеяванага саслоўя да 1814 году ўплывала «антычная» мода. Яе радзімай была рэвалюцыйная Францыя. Разам з модай на «грэцкі» строй распаўсюджваюцца «рымскі» і «турэцкі» стылі. Падчас кіравання Напалеона «антычная» мода мадыфікавалася ў стыль «ампір». Сярод мужчын распаўсюдзіліся разнастайныя мундзіры. На змену лёгкім тканінам прыйшлі цяжкія, зала-тая вышыўка, масіўныя каштоўнасці – сімвалы саслоўнага, радавога і асабістага статусу [20, с. 150 – 156].

Моду дваццатых гадоў XIX стагоддзя вызначаў рамантызм, з уласцівымі яму падабенствамі да сярэднявечных строяў і ўсходняй экзотыкі. У мужчынскі гардэроб гэтага часу ўваходзілі фрак (чорны – ў афі-цыйных абставінах і каляровы – штодзённы), сурдут (штодзённая вопратка), камізэлька (найбольш маляўнічая частка строю). Верхняя вопратка складалася з рэдынгота і карыка (адменнае паліто). У хатнім ужытку папулярнасць атрымалі шлафрокі. Разнастайнасцю вызначаліся шляпы. Увайшлі ў моду акуляры. Жаночы сілуэт эпохі рамантызму адыходзіць ад натуральных абрысаў і набывае геаметрычныя формы, што дасягаецца дзякуючы выкарыстанню гарсэта. Колеры сукенак гэтага часу светлыя, іх упрыгожваюць букетамі і гірляндамі кветак. Распаўсюджваюцца разнастайныя наміткі і баваўняныя тканіны [20, с. 156 –164].

У трыццатыя гады ў жаночай модзе капот на кітовым вусе (накідка з атласа на бавоўне), летам – мантылі з тафты, узімку – салопы (футра). Жаночыя капялюшыкі гэтага перыяду ўпрыгожваюцца пер’ем, кветкамі, стужкамі, ужываецца вуаль. З аксесуараў робяцца папулярнымі рыдыкюлі, сакі, муфты, парасоны. Мужчынскі сілуэт у модзе трыццатых гадоў паўтарае жаночы, што змушае мужчын карыстацца гарсэтам. Вынаходствам трыццатых гадоў былі курткі, куртатыя нагавіцы, купальныя касцюмы [20, с. 164 – 170].

На моду саракавых гадоў уплывала творчасць Ч. Дзікенса і Ж. Санд. У жаночы строй як праявы эмансіпацыі пачынаюць уваходзіць дэталі мужчынскай вопраткі. Напрыклад, «амазонка» – строй для вер-хавой язды. Мужчынскі касцюм ў гэты час набыў выгляд, які амаль без зменаў пратрываў да канца XIX ста-годдзя. У мужчынскай вопратцы стаў пераважаць чорны колер. Абавязковым атрыбутам робіцца ляска, распаўсюджваюцца манoклі, пенснэ, ларнеты. Мужчынскі строй робіцца фонам для эфектнай жаночай вопраткі [20, с. 170 – 173].

Мода пяцідзесятых гадоў дэмакратызуецца, элементы строю робяцца амаль аднолькавымі для ары-стакратыі і паспольства. У жаночай модзе працягваецца тэндэнцыя да запазычвання дэталяў з мужчын-скай вопраткі. Жаночыя венгеркі (жакеты) нагадваюць мужчынскія фракі. Пад шырокія спадніцы апра-наюцца вузкія панталоны. Распаўсюджваюцца гладкія прычоскі. Вялікай разнастайнасцю вызначаецца верхняя вопратка. У моду ўваходзяць шырокія спадніцы на абручах – крыналіны. Унармоўваецца трады-цыя па выкарыстанню колераў ў вопратцы – сталыя асобы апранаюцца ў ліловыя, сінія, цёмна-зялёныя, цёмна-чырвоныя строі, моладзь – у белыя, блакітныя, ружовыя. Цалкам, вопратка арыстакратыі вызна-чаецца сціпласцю колеру і стрыманасцю малюнка [20, с. 173 – 175].

Іншаземныя ўплывы не касавалі цалкам мясцовых асаблівасцяў. Маламаёмасная шляхта, якая імкнулася пераймаць вобраз жыцця паноў, у рэалізацыі найноўшых павеваў выкарыстоўвала танны матэрыял і элементы старадаўніх апранах. У выкананні местачковых рамеснікаў-яўрэяў парыжскія модныя крoі атрымлівалі своеасаблівую інтэрпрэтацыю. Адзенне засцянковай шляхты вылучала яе ў досыць маляўнічую групу. У якасці святочнага строю гэтай часткай шляхты працяглы час выкарыстоўвалася рознакаляровае суконнае верхняе адзенне, аздобленае атласам, аксамітам і галунамі. Сацыяльную прыналежнасць жупана фіксуе прымаўка: «Убраўся ў жупан і гадае, што пан» [21, с. 237]. У маламаёмаснай шляхты было менш функцыянальных відаў строю, у адрозненні ад арыстакратыі, вопратка якой мела размежаванне па гадзінам дня, сезонам і прызначэнню (для візітаў, шпацыру, летнія «вясковыя», гарадскія, бальныя, для тэатру, для гульні ў тэніс і гэтак далей) [20, с. 149].

Строй дробнай шляхты вызначаўся кансерватызмам, што вынікала з яе абмежаваных эканамічных абставінаў. Тканіна, напрыклад, часцяком выраблялася ў хатніх умовах. Але толькі эканамічнымі чыннікамі растлумачыць адданасць старадаўняму крою немагчыма. Гэтая вопратка працягвала захоўваць статусна-знакавую функцыю ў побыце дробнага шляхецтва. Яшчэ адной прычынай устойлівасці густаў дробнай шляхты з’яўлялася недастатковая сацыяльная мабільнасць і брак камунікацый. Дробная шляхта складала досыць закрытую групу – суседства вясковых засценкаў жылі амаль натуральнай гаспадаркай і абменьваліся прадуктамі сваёй вытворчасці наўпрост паміж сабой, часта мінаючы гандлёвых пасрэднікаў [2, с. 101]. Магнаты і панства бавіліся ў еўрапейскіх сталіцах, апраналіся па апошняй модзе, але атмасфера іх маёнткаў, заселеных шматлікімі рэзідэнтамі-прыжываламі, была закансервавана на ўзор мінулага стагоддзя. З розніцай, што рэзідэнты ўжо не насілі зброю, і апраналі не кунтушы, а даўгаполыя сурдуты [32, с. 133].

Змены адбываліся і ў гардэробе дробнай шляхты, але новае засвойвалася са значным спазненнем. Сучаснікі адзначалі ў строі дробнай шляхты элементы, што даўно выйшлі з моды, але відавочна заставаліся актуальнымі для дадзенага асяроддзя як прадметы франтаўства [2, с. 47]. Венгеркі, казакіны, фракі з гардэроба правінцыйнай шляхты грашылі супраць моды неадпаведнымі колерамі і празмернай аздобай [2, с. 47].

Зрэшты, і ў такім выглядзе святочны строй дробнай шляхты дасягаў належнага эфекту. Разлічаны ён быў на сялянства. Для засцянковай шляхты актуальным было не столькі прыпадабненне з найноўшымі французскімі ўзорамі моды, колькі вылучэнне з сялянскага асяроддзя, лад жыцця і побыт якога яна ў значнай ступені падзяляла. Адрозненні тут часта ў нюансах. Сацыяльную інфармацыю нёс

крой вопраткі, якасць матэрыялу і аздобы, афарбоўка, характар ўпрыгожанняў. Істотнае значэнне мела і манера нашэння строю. Напрыклад, кашулю ў сярэдзіне XIX стагоддзя насілі і сяляне, і шляхта, але апошнія запраўлялі яе ў нагавіцы, у адрозненні ад сялянскай манеры апранаць кашулю на нагавіцы [21, с. 234]. Нават у рабо-чай вопратцы шляхты пільнавалася сацыяльна-рэпрэзентатыўныя функцыя. Напрыклад, жанчыны-шляхцянкі гаспадарчыя работы выконвалі ў ніцяных пальчатках [22, с. 467].

У штодзённым побыце дробную шляхту вылучала досыць памяркоўнае стаўленне да ўласнага знешняга выгляду. Мужчыны не грэбавалі і дзіравымі ботамі [23, с. 66]. Штодзённая вопратка ў шляхціца вызначалася бясформеннасцю – гэта былі насовы, балахоны, даматканыя капоты [2, с. 57]. Як святочным, так і штодзённым адзеннем шляхты выступаў сурдут у разнастайных адменах крою. Штодзённай вопрат-кай былі таксама чорны або шэры суконны кафтан, картуз. За шэры колер сукна верхняй вопраткі беднае шляхецтва называлі шарачковым. Аздобай беларускага шляхціца былі вусы. Бароды не адрошчваліся, але галіліся шляхцюкі не штодня [2, с. 79]. Шляхцянкі насілі кофты, спадніцы з паркалю, паліто старажыт-нага крою, featured рознакаляровыя кунтушы з пазументамі. Да палудні правілы добрага выхавання раілі жанчы-нам апранаць практычныя сукні з тканіны, што добра падпадаюць праннію, каб займацца хатняй гаспа-даркай, і толькі па абедзе рэкамендавалася апранаць лепшыя ўборы для сустрэчы гасцей.

Такім чынам, інтэнсіўнасць рэцэпцыі замежных модных тэндэнцый залежала ад маёмаснага і сацыяльнага становішча індывіда. Больш адкрытай для пераймання групай з’яўлялася сярэдняя і буйная шляхта, у строі якой амаль страчваюцца нацыянальныя рысы. Наступствы знешніх ўплываў у вопратцы дробнай шляхты былі меней выразнымі і паслядоўнымі.

Гастранамічныя густы прывілеяванага саслоўя Беларусі гістарычна фарміраваліся пад уплывам знешніх традыцый: польскай, нямецкай, французскай, італьянскай, венгерскай, татарскай, яўрэйскай. Шляхецкую кухню вызначала больш шырокае ў параўнанні са звычаямі іншых саслоўяў выкарыстанне імпартных прадуктаў, такіх як віно, кава, гарбата, ікра, цукар, соль, спецыі. Іх спажыванне набывала прэстыжна-знакавыя прыкметы, сімвалізавала багацце і шляхетнасць дому.

У першай траціне XIX стагоддзя варэўныя прыхільнасці мясцовай арыстакратыі вызначала французская мода. У абсталяванні кухань прытрымліваліся англійскіх ўзораў [24, с. 14]. Гастранамічныя сімпатыі сярэдняй шляхты былі закансерваваныя натуральным ладам сельскагаспадарчай вытворчасці. Асаблі-васцю традыцыйнай шляхецкай кухні з’яўлялася шырокае ўжыванне прадуктаў збіральніцтва і палявання. Шляхта ўпадабала тлустыя мясныя стравы, якія выраблялісь з выкарыстаннем вострых соусаў ды пры-праў. Адрознівала шляхецкую кухню таксама любоў да салодкага. У шляхты Віцебскай губерні падсало-джвалі, напрыклад, каўбасную масу, змешваючы яе з цёртымі яблыкамі і ягадамі [21, с. 196]. Салодкія прысмакі, якія гатаваліся з выкарыстаннем рысу і кіякоў, былі запазычаны з Усходу. З мясцовых дэсертаў вызначаліся салодкія цесты. Цукар замяняўся зазвычай мёдам і макам [12, с. 350]. Агародніна, садавіна, ягады ўжываліся пераважна мясцовага паходжання. Модным зрабілася вырошчванне цытрусавых ва ўласных аранжарэях.

Рацыён харчавання шляхты вагаўся ў залежнасці ад сезона года і рэлігійна-абрадавага календару. Шчодрым на прысмакі перыядам з’яўляўся мясаед – час між Калядамі і Масленіцай. Але нават у пост святочны шляхецкі стол уражваў разнастайнасцю страў, гатаваных з выкарыстаннем рыбы, грыбоў, капусты, гароху, рысу, разынак, маку. Багаты стол быў у традыцыі тутэйшай хлебасольнасці. Гасціннасць з’яўлялася атрыбутам шляхецкага ладу жыцця.

Маламаёмасная шляхта ўжывала пераважна тыя ж прадукты харчавання, што і сялянства. Адрозненні палягалі ў якасці і разнастайнасці ежы. У Цэнтральнай і Паўночна-Заходняй Беларусі, напрыклад, у сем’ях дробнай шляхты зазвычай варылі капусту і буракі; шляхта ўпадабала мучныя клёцкі з дадаткам сыру, маку, цыбулі і канаплянага масла. Штодзённай ежай у прывілеяванага саслоўя, таксама як і ў сялян-ства, з’яўляўся хлеб. У шляхты Віцебшчыны, напрыклад, карыстаўся попытам хлеб з дабаўкай дранай бульбы [21, с. 179]. Смаргонскія абаранкі, ашмянскія і лідскія крэндзелі ды пернікі – звычайныя кірмаш-ныя прысмакі – былі папулярнымі як сярод сялянства, так і ў шляхты. Значна часцей на шляхецкім стале ў адрозненні ад сялянскага сустракалася марская рыба, мяса птушкі і свойскай жывёлы.

У 30-я гады XIX стагоддзя пачала інтэнсіўна трансфармавацца сістэма грамадскага харчавання. З пашырэннем сеткі расійскіх рэстарацыяў, тракціраў і чайных распаўсюджвалася руская кулінарыя. З ростам унутранага рынку ў Беларусі разгарнулася прамысловая вытворчасць піва, сыра, цукру, сланечнікавага алею, што пацясніў у структуры спажывання традыцыйныя ільняны і канапляны алеі. З развіц-цём бульбагадоўлі павялічваецца выраб крухмалу, патакі, таннай гарэлкі. Апошняя пачала выціскаць тра-дыцыйныя моцныя трункі – мёд і наліўкі, скарачаліся аб’ёмы ўжывання піва. Пашырыўся асартымент страваў, прыгатаваных з бульбы. Запазычванне бульбяных рэцэптаў адбывалася з нямецкай і яўрэйскай кухань. Завоз больш перспектыўных пародаў хатняй жывёлы і новых харчовых тэхналогій з Англіі, Га-ландыі, Швейцарыі стымуляваў цягам першай паловы XIX стагоддзя развіццё свінагадоўлі. У

выніку павя-лічваецца спажыванне мяса [25, с. 12]. Удасканальвалася арганізацыя малочнай гаспадаркі Беларусі, складваліся перадумовы для вытворчасці новай прадукцыі [26, с. 30].

На працягу першай паловы XIX стагоддзя пачынае разбурацца традыцыйная натуральная сістэма жыццязабеспячэння шляхецкай гаспадаркі. Гэтаму працэсу шляхецтва супраціўлялася, намагаючыся і на-далей вырабляць як мага больш шырокі асартымент прадуктаў для ўласнага спажывання, даволі часта насуперак эканамічнай карысці [32, с. 132]. Але значная частка харчавання ўжо набывалася звонку. Паступова збліжаліся гастранамічныя стэрэатыпы розных станаў насельніцтва Беларусі, найперш – мяшчанскай і шляхецкай кухань. Разам з запазычаннем заходнееўрапейскіх і расійскіх кулінарных элементаў мясцовая кухня сталася больш збалансаванай, на замену экзатычным дарагім прадуктам шырэй уводзіліся мясцовыя. Гатаванне зрабілася больш тэхналагічным працэсам.

Кулінарыя была часткай міфу «залатой эпохі» Рэчы Паспалітай. Сучаснікі канстатавалі дэградацыю кулінарнага майстэрства (напрыклад, страту старадаўніх рэцэптаў), змяншэнне асартыменту традыцыйных страваў, збядненне жыўнасці лясоў, азёр ды рэк [31, с. 98]. Дзякуючы эміграцыі адбывалася папулярызацыя здабыткаў мясцовай кулінарнай думкі ў Заходняй Еўропе. З'явіліся першыя спробы кадыфікацыі тутэйшай рэцэптуры. Як прыклад, кніга Г. Цюндзявіцкай «Літоўская гаспадыня» (1848) [24]. Усё разам гэта стварала передумовы для фармавання агульнанацыянальнай кухні, інтэграванай у еўрапейскую кулінарную традыцыю. Але разнастайнасць стэрэатыпаў спажывання ў асяроддзе прывілеяванага грамадства Беларусі не знікала цалкам. Яе вытокі былі не толькі ў эканамічнай неаднастайнасці саслоўя, але і ў яе канфесійнай дыферэнцыяцыі. Прадстаўнікі праваслаўнага, каталіцкага, пратэстанскага веравызнанняў працягвалі датрымлівацца ў сваіх завядзёнках адрозных рэлігійна-абрадывых норм [27, с. 315].

Матэрыяльная культура выяўляе як вітальныя патрэбы грамадства, так і яго мастацкія, этычныя, ідэалагічныя ды прэстыжна-знакавыя падабанні [28, с. 128]. Адпаведна, знешнія ўплывы ў фарміраванні матэрыяльнай культуры маюць наўпроставую карэляцыю з працэсамі ў абсягу сацыяльнага і ментальнага. У першай палове XIX стагоддзя побытава-рэчывае асяроддзе паступова губляла свае традыцыйныя рысы, уніфікавалася суладна агульнаеўрапейскім тэндэнцыям. Найбольш інтэнсіўна гэты працэс адбываўся ў асяроддзі арыстакратыі і заможнай шляхты. Страта актуальнасці традыцыйнага культурнага канону выяў-лялася, з аднаго боку, у неразуменні культурна-гістарычнай каштоўнасці памятак мінулага. Як прыклад, пераробка старых маёнткаў, знішчэнне слуцкіх паясоў, якія суладна модзе пераплаўляліся дзеля штам-поўкі срэбнага сталовага посуду [29, с. 86]. З другога боку, назіраліся спробы музеефікацыі памятак шляхецкай самабытнасці, ствараліся разнастайныя калекцыі.

З трыццатых гадоў XIX стагоддзя змены культурнага канону набываюць новую дынаміку, якую фундавалі ў значнай ступені вымога расійскай адміністрацыі па гамагенізацыі этнасацыяльнай прасторы «Паўночна-Заходняга краю». Што, з іншага боку, выклікала супраціў. Як прыклад, распаўсюджанне ў архітэктуры шляхецкіх двароў і рэзідэнцый рэтраспектыўна-гатычнага стылю. Гэта было выяўленнем культурнай фронды, памкненнем падкрэсліць еўрапейскі характар шляхецкай культуры былой Рэчы Паспалітай. Акрамя таго, папулярнасць рэтраспектыўнай готыкі вынікала з патрэбы глорыфікацыі мясцо-вых дваранскіх радоў, сцвярджэннем старажытнасці іх паходжання.

Каналам культурных уплываў заставаліся рэлігійныя канфесіі. Каталіцкі касцёл транслюваў, як правіла, польскую культурную традыцыю, праваслаўная царква – расійскую. Замежныя культурныя ўплывы даволі часта былі ўскоснымі, напрыклад, праз побытавае ўзаемадзеянне з этнічнымі меншасцямі ў Беларусі, праз міжнацыянальныя шлюбы. У Беларусі было досыць змешаных беларуска-польскіх, беларуска-французскіх [30, s. 5], беларуска-расійскіх. Былі выпадкі беларуска-яўрэйскіх шлюбаў. Беларуска- расійскія шлюбы санкцыянаваліся вышэйшымі коламі Расійскай дзяржавы як сродак інтэграцыі польска-моўнай эліты ў агульнадзяржаўнае жыццё імперыі. Але і з боку пэўных колаў польскамоўнай арыста-кратыі такія шлюбы разглядаліся прагматычна як спроба захавання свайго палітычнага ўплыву і экана-мічнага дабрабыту [31, с. 131]. Шмат французаў, ангельцаў, немцаў служылі ў беларускіх сем'ях гувернё-рамі, настаўнікамі. Пэўная колькасць прадстаўнікоў прывілеяванага грамадства Беларусі служылі ў напа-леонаўскім войску, дзе засвойвалі французскія культурныя стэрэатыпы. Найбольш істотным чыннікам расійскага культурнага ўплыву ў Беларусі былі вайскоўцы ды купецтва. Расійскае чыноўніцтва, святар-ства, настаўнікі па розных прычынах не з'яўляліся ўзорамі культурнага пераймання і часта самі пад-падалі пад культурны ўплыў з боку мясцовых прадстаўнікоў прывілеяванага грамадства [32, с. 109].

**Заключэнне.** Можна канстатаваць значную трансфармацыю матэрыяльнай культуры прывілеяваных саслоўяў Беларусі першай паловы XIX стагоддзя пад уплывам заходнееўрапейскіх і расійскіх узораў.

Пасля паразы паўстання 1831 года шляхецкая культура паступова страчвае дамінуючую пазіцыю ў грамадстве, паступова пераўтвараецца ў культуру шляхецка-інтэлігенцкую, у якую пачынаюць пранікаць

элементы мяшчанскай культуры. Кансервуецца і музеефікуецца побыт шляхецкіх маёнткаў і рэзідэнцый, апошнія ператвараюцца ў анклавы старасвецкасці, інстытуты сацыялізацыі маладога шляхецкага пакалення.

ЛІТАРАТУРА

1. Горадабудаўніцтва і палацавая архітэктура ў канцы XVI – пач. XX ст. / Л.А. Базан [і інш.] // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1993 – 2003. – Т. 1. – 1993.
2. Шпилевский, П.М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П.М. Шпилевский; текст. подгот. С.А. Кузняевой. – Мінск: Юнацтва, 1992. – 251 с.: ил. – (Лит. памятники Белоруссии).
3. Цітоў, В.С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі / В.С. Цітоў. – Мінск: Беларусь, 1996. – 208 с.
4. Gloger, Z. Budownictwo drzewne i wyroby z drzewa w dawnej Polsce: w 2 t. / Z. Gloger. – Warszawa: Druk Wl. Lazarskiego, 1907 – 1909. – T. 1. – 1907. – 383 s.
5. Лакотка, А.І. Пад стрэхамі прашчураў / А.І. Лакотка. – Мінск: Полымя, 1995. – 384 с.
6. Страчаная спадчына / Т.В. Габрусь [і інш.]; уклад. Т.В. Габрусь. – Мінск: Полымя, 1998. – 351 с.: іл.
7. Беларусь у малюнках Напалеона Орды. Другая палова XIX стагоддзя / укл. А.М. Кулагін [і інш.]. – Мінск: Ураджай, 2001. – 144 с.
8. Беларусы / рэдкал.: А.І. Лакотка [і інш.]. – Мінск: Бел. навука, 2005. – Т. 8: Дэкаратыўнапрыкладное мастацтва / Я.М. Сахута. – Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя. К. Крапівы НАН Беларусі. – 351 с.: іл.
9. История интерьера и мебели / А.А. Барташевич [и др.]; под общ. ред. А.А. Барташевича. – Ростов н/Д: Феникс, 2004. – 400 с.: ил.
10. Маленко, Л.И. Белорусский костюм XIX – XX вв. / Л.И. Маленко. – Минск: Бел. наука, 2006. – 142 с.
11. Цітоў, В.С. Адзенне / В.С. Цітоў // Народная культура Беларусі: энцыкл. давед. / пад агульнай рэд. В.С. Цітова. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 21 – 28.
12. Мальдзіс, А.В. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі / А.В. Мальдзіс. – Мінск: Лімарыус, 2001. – 384 с.
13. Bartkiewicz, M. Polski ubiór do 1864 roku / M. Bartkiewicz. – Wroclaw: Zaklad Narodowy im. Ossolinskich, 1979. – 146 s.
14. Кісялёў, Г.В. Жылі-былі класікі: Хто напісаў паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе» / Г.В. Кісялёў. – Мінск: Бел. навука, 2005. – 549 с.: іл.
15. Іван Хруцкі. Альбом-каталог / укл. І.М. Паньшына [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 1990. – 120 с.: іл.
16. Кирсанова, Р.М. Русский костюм и быт XVIII – XIX веков / Р.М. Кирсанова. – М.: Слово, 2002. – 224 с.
17. Патоцкі, Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану / Л. Патоцкі. – Мінск: Полымя, 1997. – 270 с.
18. Ильин, А. Брестский заговор 1846 года / А. Ильин // Гістарычная брама. – 2003. – № 1(21). – С. 49 – 52.
19. Хёйзинга, Й. Homo Ludens / Человек играющий. Статьи по истории культуры / Й. Хёйзинга. – 2-е изд., исправл. – М.: Айрис-пресс, 2003. – 496 с.
20. Захаржевская, Р.В. История костюма: От античности до современности / Р.В. Захаржевская. – 3-е изд., доп. – М.: Рипол-классик, 2004. – 288 с.: ил.
21. Цітоў, В.С. Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці / В.С. Цітоў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 300 с.
22. Максимов, С.В. Белорусская смоленщина с соседями / С.В. Максимов // Живописная Россия: в 12 т. / под общ. ред. П.П. Семенова. – М.: Вольфа, 1882. – Т. 3: Литовское и Белорусское Полесье / А.К. Киркор, П.П. Семенов, С.В. Максимов. – 2-е изд. – Мінск: БелЭн, 1994. – С. 429 – 473. – (Репринт. восп.).
23. Хаўстовіч, М.В. Гісторыя беларускай літаратуры 30 – 40-х гады XIX ст. / М.В. Хаўстовіч. – Мінск: БДУ, 2001. – 171 с.
24. Цюндзявіцкая, Г. Літоўская гаспадыня, ці Навука аб утрыманні ў добрым стане хаты... / Г. Цюндзявіцкая. – Мінск: Полымя, 1993. – 366 с.: іл.
25. Дзядзенка, З. «Дзедка свінушку ўбіў...» / З. Дзядзенка // Спадчына. – 2003. – № 2 – 3. – С. 8 – 13.
26. Белы, А. Літоўскі сыр / А. Белы // Спадчына. – 2003. – № 2 – 3. – С. 30 – 41.
27. Felińska, E. Pamiętniki z życia Ewy Felińskiéj. Seria II: w 2 t. / E. Felińska. – Wilno: Nakł. i drukiem J. Zawadzkiego, 1858 – 1859. – Tom 1. – 1858. – 420 s.
28. Лурье, С.В. Историческая этнология / С.В. Лурье. – М.: Аспект Пресс, 1997. – 448 с.

29. Ельскі, А. Выбранае / А. Ельскі; укл. Н. Мазоўка. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004. – 496 с.: іл. – (Беларускі кнігазбор; Сер. II. Гісторыка-літаратурныя помнікі).
30. Jezierska, W. Z zycia dworow i zamkow na Kresach / W. Jezierska. – Poznan: Dr. Dziennika Poznańskigo, 1924. – 109 s.
31. Булгарын, Ф. Выбранае / Ф. Булгарын; уклад., прадм., камент. А. Фядуты. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2003. – 592 с. – (Беларускі кнігазбор; Сер. II. Гісторыка-літаратурныя помнікі).
32. Цвікевіч, А. «Западно-руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цвікевіч; пасляслоўе А. Ліса. – 2-е выд. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.

*Паступіў 16.11.2007*